3. Кодекс Российской Федерации об административных правонарушениях : 30 дек. 2001 г., № 195-ФЗ : принят Гос. Думой 20 дек. 2001 г. ; одобр. Советом Федерации 26 дек. 2001 г. : в ред. Федер. Закона от 26.01.2022 г. // Российская газета. – 2022 г. – 18 фев. – С. 10.

4. Манойло, А. В. «Фейковые новости» как угроза национальной безопасности и инструмент информационного управления / А. В. Манойло // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 12. Политические науки. – 2019. – № 2. – С. 36–40.

5. Оржаховская, И. Ю. Становление внешней функции Российского государства в период IX-XVI вв.: постановка проблемы исследования / И. Ю. Оржаховская // Юристъ – Правоведъ. – 2023. – Вып. 104, № 1. – С. 16–21.

6. Саенко В. Н. Манипуляция сознанием в современных общественных практиках / В. Н. Саенко // Телескоп. – 2021. – № 2. – С. 124–130.

***А.У. Кімбар**, магістр гістарычных навук, выкладчык МГПК (Мінск)*

# АРГАНІЗАЦЫЯ ДЗЕЙНАСЦІ ПОШУКАВА-ДАСЛЕДЧАГА АТРАДА «ПАМЯЦЬ»

У мэтах фарміравання аб'ектыўных адносін грамадства да гістарычнага мінулага, захавання і ўмацавання адзінства беларускага народа Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2022 г. быў аб'яўлены Годам гістарычнай памяці [1]. Важнае месца ў захаванні гістарычнай памяці займае захаванне памяці аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны. Гэта пацвярджаецца, у тым ліку, і ўнясеннем у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь тэзіса пра тое, што дзяржава захоўвае гістарычнай праўду і памяць аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны [2, с. 74].

Вывучэнне Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў у ДУА «Мінскі гарадскі педагагічны каледж» пачынаецца на першым курсе на вучэбных прадметах «Гісторыя Беларусі» і «Сусветная гісторыя» і факультатыўных занятках па гісторыі Беларусі. Навучальнымі праграмамі прадугледжана вывучэнне такіх аспектаў, як гераізм і патрыятызм савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, партызанская і падпольная дзейнасць на акупаванай тэрыторыі Беларусі, уклад беларускага народа ў перамогу над нацысцкай Германіяй, разгляд праблемы калабарацыянізму ў гады Вялікай Айчыннай вайны [3].

Навучэнцы і выкладчыкі каледжа на працягу доўгага часу бяруць удзел у рэспубліканскіх і міжнародных мерапрыемствах, прысвечаных захаванню памяці аб ахвярах і гераічным подзвігу савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Так, у 2018 г. па выніках пошукава-даследчай працы

была выдадзена кніга навучэнкі каледжа Я.К. Саевіч «З летапісу ратнай доблесці», у якой сабраны ўспаміны відавочцаў пра вайну [4]; у 2019 г. работа «Цыкл мерапрыемстваў, прысвечаных 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне: вопыт ДУА «Мінскі гарадскі педагагічны каледж»»» выкладчыкаў А.У. Кімбара і А.Г. Казака была ўдастоена дыплома Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама [5]; навучэнцы і выкладчыкі каледжа прымаюць актыўны ўдзел у праекце «Наша агульная Перамога», які арганізаваны СПб ДБПАУ «Педагагічны каледж № 8» [6]; навучэнцы і выкладчыкі прынялі ўдзел у шэрагу навуковых канферэнцый і круглых сталоў, прысвечаных праблематыцы Вялікай Айчыннай вайны і аднаўленню народнай гаспадаркі рэспублікі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе [7; 8; 9].

Гэта стала зыходным пунктам стварэння ў Мінскім гарадскім педагагічным каледжы пошукава-даследчага атрада «Памяць», асноўнай мэтай якога з'яўляецца захаванне і ўвекавечанне памяці аб удзельніках і загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Першамайскага раёна г. Мінска.

Атрад выконвае шэраг функцый, сярод якіх можна вылучыць навуковае даследаванне краязнаўчага аб'екта (Першамайскі раён г. Мінска); далучэнне навучэнцаў да навукова-даследчай і пошукавай работы; арганізацыю сумеснай працы з дзяржаўнымі і грамадскімі структурамі; удзел у фарміраванні дзяржаўнай палітыкі ў пытаннях увекавечання памяці загінуўшых пры абароне Айчыны; удзел у патрыятычных акцыях, конкурсах, выставах, экскурсійных праграмах і іншых мерапрыемствах патрыятычнай накіраванасці.

Вынікі дзейнасці атрада адлюстроўваюцца ў публікацыі пошукавых работ у сродках масавай інфармацыі, стварэнні інтэрнэт-праектаў, у навуковых артыкулах і г.д.

У 2021 / 2022 навучальным годзе ў межах дзейнасці пошукава-даследчага атрада пачаў рэалізавацца шэраг праектаў, які застаюцца актуальнымі і на сённяшні дзень. У рамках работы клуба «ПЗ ФАРМАТ: педагог-патрыёт-прафесіянал» стартаваў праект «Маладзёжны гісторыка-патрыятычны турызм» [10]. Навучэнцы і выкладчыкі наведваюць музеі г. Мінска, экспазіцыі якіх маюць дачыненне да падзей Вялікай Айчыннай вайны, і знакавыя месцы рэспублікі. Так, нашы навучэнцы наведалі мемарыяльны комплекс Хатынь, гісторыка-культурны комплекс «Лінія Сталіна», Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.

23 лютага 2022 г. адбыўся мітынг-рэквіем «Перамога, здабытая адзінствам», падчас якога навучэнцы і педагогі Мінскага гарадскога педагагічнага каледжа разам з В.М. Кузняцовым, намеснікам генеральнага дырэктара

ААТ «Мінскі механічны завод імя С.І. Вавілава», дэпутатам Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, усклалі кветкі да манумента «Смуткуючая маці» ў парку культуры і адпачынку ім. Чалюскінцаў [11].

Адным з напрамкаў дзейнасці атрада з’яўляецца стварэнне інтэрнет-праекта «Славутыя імёны на карце Першамайскага раёна г. Мінска”. У яго межах навучэнцы Мінскага гарадскога педагагічнага каледжа пры супрацоўніцтве з Цэнтральным навуковым архівам НАН Беларусі (структурнае падраздзяленне Інстытута гісторыі НАН Рэспублікі Беларусь) прадставілі інтэрнэт-карту «Імёны навукі ў гарадской прасторы» і прыступілі да стварэння віртуальнай карты «Імёны герояў Вялікай Айчыннай вайны на карце Першамайскага раёна г. Мінска» [12].

У межах дзейнасці атрада рэалізуюцца сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны і іх сем'ямі, праведзяцца інтэрв'ю і апытанні; навучэнцы і выкладчыкі ўдзельнічаюць у навуковых канферэнцыях і круглых сталах. Запланавана аказанне пасільнай дапамогі Адміністрацыі Першамайскага раёна г. Мінска па доглядзе помнікаў і мемарыялаў вайсковай славы; правядзенне мітынгаў-рэквіумаў «Помнім сэрцам», прымеркаванага да знакавых дат, звязаных з гісторыяй Вялікай Айчыннай вайны.

Пошукава-даследчы атрад «Памяць», членамі якога з’яўляюцца навучэнцы і выкладчыкі ДУА «Мінскі гарадскі педагагічны каледж», аб’ядноўвае неабыякавых людзей, якія рэалізуюць шэраг праектаў па захаванні і ўвекавечанні памяці пра ўдзельніках і загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны. Дзейнасць дадзенага атрада становіцца грунтоўным падмуркам для арганізацыі раённага цэнтра пошукавай работы.

## Спіс крыніц


1. Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=3961&p0=P32200001. – Дата доступа: 06.11.2023.

2. Конституция Республики Беларусь = Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь = Constitution of the Republic of Belarus : с изменениями и дополнениями, принятыми на республиканских референдумах 24 ноября 1996 г.. 17 октября 2004 г. и 27 февраля 2022 г. – Минск : Национальный центр правовой информации Республики Беларусь, 2022. – 192 с.

3. Национальный образовательный портал [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie/uchebnye-predmety-v-xi-klassy/istoriya-belarusi.html. – Дата доступа: 09.11.2023.

4. Саевич, Е. К. Из летописи ратной доблести / Е. К. Саевич. – Минск : Ковчег, 2018. – 60 с.

5. Государственное учреждение Минский городской учебно-методический центр профессионального образования [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://gumcpo.minsk.edu.by/ru/main.aspx?guid=37093. – Дата доступа: 06.11.2023.

6. Международный проект «Наша общая Победа» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.pedagog8.ru/college/cpd/3665-mezhdunarodnyj-proekt-nasha-obshchaya-pobeda. – Дата доступа: 11.11.2022.

7. Анифер, Л. В. Лихие дороги войны: Великая Отечественная война в судьбе М. К. Федоровича / Л. В. Анифер // «Живая память» : сборник эссе учащихся, посвященный 75-летию Победы в Великой Отечественной войне : в 3 ч. / Центр молодежных инноваций. – Минск, 2020. – Ч. 1. – С. 16–17.

8. Кімбар, А. У. Удзел камсамольскіх арганізацый у аднаўленні і развіцці прамысловасці БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе / А. У. Кімбар // Пичетовские чтения – 2020: войны в истории человечества. К 75-летию Победы над фашизмом : материалы междунар. науч.-практ. конф., Минск, 21 окт. 2020 г. / Белорус. гос. ун-т ; под общ. ред. А. Г. Кохановского ; науч. ред. М. Ф. Шумейко, О. А. Яновский. – Минск, 2020. – С. 105–110.

9. Кімбар, А. У. Дзейнасць АСАВІЯХІМ БССР у 1943–1948 гг. / А. У. Кімбар // Научные труды Респ. ин-та высш. шк. Истор. и психол.-педагогические науки : сб. науч. ст.: в 4 ч. – 2021. – Вып. 21, Ч. 1. – С. 195–203.

10. Проект «Молодежный историко-патриотический туризм» [Электронный ресурс] // Государственное учреждение образования «Минский городской педагогический колледж». – Режим доступа: http://pedkol.minsk.edu.by/ru/main.aspx?guid=4081. – Дата доступа: 08.03.2022.

11. Победа, добытая единством [Электронный ресурс] // Государственное учреждение образования «Минский городской педагогический колледж». – Режим доступа: http://pedkol.minsk.edu.by/ru/main.aspx?guid=38873. – Дата доступа: 08.11.2023.

12. Праект-акцыя «Імёны навукі ў гарадской прасторы» [Электронный ресурс] // Государственное учреждение образования «Минский городской педагогический колледж». – Режим доступа: http://pedkol.minsk.edu.by /ru/main.aspx?guid=37953. – Дата доступа: 08.11.2023.

***А.А. Киселев**, кандидат исторических наук, доцент*
*БГЭУ (Минск)*

## ПОЛЬСКОЕ ВОССТАНИЕ 1863–1864 гг. ЧЕРЕЗ ПРИЗМУ GOOGLE TRENDS

Google Trends – это инструмент для определения последних трендов в поиске Google, который отражает популярность запросов [1].